


Покліч Волі плюс

чэрвень
№5(15)
2005

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

22 ЧЭРВЕНЯ— ДВА ГАДЫ БЯЗ БЫКАВА


Два гады мы ўжо бяз Быкава. Але і кожны з нас, для каго Быкаў не ікона, а частка духовага жыцьця, на два гады павялічыў сваё сяброўства з Пісьменьнікам.

Асоба Васіля Уладзіміравіча была і ёсьць тым цэнтрам вакол якога зьбіраліся і зьбіраюцца ўсе, хто хоча жыць у вольнай, дэмакратычнай Беларусі.

У чарговую гадавіну ягонай сьмерці людзі імкнуцца выказаць сваё стаўленьне да вялікага беларуса, які ўпарта імкнуўся разварушыць здумленьне сваіх сучасьнікаў глыбокімі думкамі пра нядаўняе мінулае і будучыню.

Тое, што менавіта беларусу было наканавана так разнабакова ацаніць вайну, відаць, невыпадкова. Звыклыя добра рабіць сваю працу, нашыя людзі выкладваліся да канца і ў шэрагах чырвонай арміі, і ў войску Андарсана, і ў партызанах, і ў паліцыі, і на працы ў баўэра, і ў любым месцы, дзе даводзілася ім выжываць. Па гэтай разнастайнасьці праяваў выжываньня нас не апярэдзіць ні адзін народ у сьвеце. У сотнях чалавечых лёсаў паўстае перад чытачом космас беларускай натуры, падштурхойваючы нас да самаўсьведамленьня і прагнозаў на будучыню.

Няма патрэбы ўслаўляць нацыянальнага генія перад тымі, хто гэтую веліч разумее, проста прыведу ягонае выказваньне з інтэрвію Беларускай службе Радыё Свабода за 22 чэрвеня 2002 году і няхай кожны сам зробіць свае высновы: «22 чэрвеня – невясёлая дата, чорная лічба календара. Для ўсяго чалавецтва, але для нас асабліва. Трохі нават дзіўна – столькі год, а ўсё помніцца. Найбольш, аднак, тымі, хто стаўся ахвярай – нашымі народамі, што на ўсход ад Нямеччыны. Немцы, як я зразумеў, хацелі б гэтую дату як мага хутчэй забыць. І гэта іх права, бо яны пацярпелі паразу. Параза, як вядома, малапрыемная рэч. Але гісторыя парадаксальная па сваёй сутнасьці. І так сталася ў часе, што пераможцы і пераможаныя нібы памяняліся ролямі. Яны – бы пераможцы, а мы – сапраўды пераможаныя, бо бедныя і зьняважаныя. Чаму так? Але гэта пытаньне для нас. Немцы на яго даўно адказалі. А мы не навучаныя разважаць гэткім чынам, мы задавольваемся старэчай эйфарыяй ад даўняй перамогі, якая на справе ёсьць перамога ня нашая. А чыя – во гэта таксама пытаньне, на якое наша грамадзкая думка дагэтуль ня мае выразнага адказу. Можа баімося? Ці гэткія дурні, што не разумеем? Ці нам не даюць зразумець... Але ж зразумець – ужо палова шляху да ісьціны. Відаць, другую палову суджана прайсьці ня нам. І тое крыўдна і балюча, асабліва 22-га чэрвеня».



Не пазнаю цябе, мой краю,
нявечыць людскасьць лад
чужы,
і прадзедаў зямля чужая,
і толькі нашыя крыжы.

І толькі нашыя магілы,
старыя ў полі курганы—
няўжо й мінуласьць нашу
скрылі
пад тоўстым насыпам яны?

Чужым нам у сэрца цэляць
словам,
каб насьмерць роднае забіць,
лучынай гасьне наша мова,
чужая—лагерам гучыць.

Ад сухавеяў, што з усходу,
плытчэе Нёман у берагах,
душа малее ў народу,
мрэ песьня, як падбіты птах.

Ў няволі крыльляў не разгорне
ні птах, ні песьня, ні душа.
Нат цэлы дзень здаецца
чорным,
хоць бы ў жа сонечны сьпярша.

Чужы палон, прыгон адвечны
махлярствам душы гне і злом,
ніжэй ўсё нам зьгінаюць
плечы
нябачным нейкім бізуном.

Стаяць над намі ўсе чужыя
ды сьцёбаюць да працы нас,
як быццам страшнага Батыя
вярнуўся незабыты час...

Ларыса Геніюш.

ЦІ НАДАЕ СЬМЕРЦЬ ЧАРГОВАГА ПРАВАДЫРА ДРАБОК СВАБОДЫ?

Рускія, а сьледам за імі і тутэйшыя людцы любяць паўтараць прыкрую і разам з тым даволі красамоўную для разуменьня рабскай ментальнасьці прымаўку: " Ад турмы і ад сумы...". Для чалавека вольнага сьвету цяжка ўцяміць: навошта так часта задумваецца над гэтымі двума малаверагоднымі для пераважнай большасьці насельніцтва момантамі жыцьця тутэйшы чалавек.

Жыхары дэмакратычных краін не маюць таго адмоўнага досьведу, які нясуць ў сабе савецкія й постсавецкія людзі. Праўда, досьвед гэты найчасьцей неўсьвядомлены, а падсьвядомы і датычыцца ён толькі асабістага прыстасавальніцтва да снуючых умоваў жыцьця ў посттаталітарнай дзяржаве. Жыцьцё ж за любы кошт разбурае натуральную прагу чалавека да свабоды, а памяць пра некалькі дзесяткаў мільёнаў забітых і закатаваных савецкай уладай суграмадзянаў сее страх і бязьвер'е ў магчымасьць зьмяніць ганебны з правамі чалавека стан у нашай краіне. Існая ж улада гэты страх культывуе і песьціць.

Фразеалагізм, безумоўна, нарадзіўся задоўга да ўзьнікненьня савецкай антысыстэмы, але і ў часы ягонага ўтварэньня ягоныя творцы былі тымі самымі шрубамі, якія ўшрубоўвала ўлада ў стварэньне ці то трэцяга Рыму, ці то расійскай імперыі. Каго ў такія моманты цікавяць асабістыя жыцьці і лёсы мільёнаў?

Нехта паспрабуе мне запярэчыць наконт неімперкасьці сёньняшняй Беларусі. Пры чым тут мы, і якое дачыненьне мае да нас прымаўка? Беларусь—не імперыя, але імперскасьць, ці лепей, так бы мовіць, постімперскі сіндром вярэдзіць мазгі не толькі прадстаўнікам лукашэнкавай улады. Верад імперскасьці нараджае нянавісьць, а нянавісьці непатрэбна свабода, ёй патрэбны аб'ект для выяўленьня сваёй лютасьці. І хлопчыкі для біцьця знаходзяцца хутка— вечнаісныя жыды, цыганы, " людзі каўказкай нацыянальнасьці", палякі, нацыяналісты, апазіцыянэры, каталікі, уніяты, крышнаіты...

Трапіць у "турму" ў сёньняшняй Беларусі можна лёгка, нават не напружваючыся, а жыцьцё на сярэднюю зарплату ці пеньсію мала розьніцца "ад сумы".

Вось і прыходзіцца цьвярозаму чалавеку спадзявацца на час ды цешыцца з таго, што ўсе савецкія і постсавецкія правадыры раней ці пазьней паміраюць ці папросту сыходзяць, што з іхняй сьмерцю нешта зьмяняецца і ў лепшы бок. А пасьля сыходу заўжды высьвятляецца, што ўсе яны калі не пачварнікі ці злодзеі, дык людзі абмежаваныя ды абцяжараныя ўсялякамі парокамі. Гэта пры жыцьці яшчэ можна нешта зьмяніць, а пасьля сьмерці кожнаму правадыру павесяць свой ярлык. Ужо навечна. І ўжо нельга будзе выдумляць казкі пра самага справядлівага і чэснага, пра дзіравыя кішэні, зь якіх павывальваліся няшчасныя цэнты, з'эканомленыя з невялічкага прэзідэнскага заробку. Нельга будзе цьвердзіць пра правільнае і няправільнае жыцьцё, пра дрэнны Захад і задушэўны Усход.

Аднак сыход нараджае новыя праблемы: прэзідэнт ці, скажам, правадыр памірае—праблема вырашана, а што рабіць з тымі, хто сьпяваў новыя песьні на стары лад? Навейшых песьняў ім ужо не засьпяваць—вось вам і душэўная крыза. А затым суіцыд, падвышэньне алькагалізьму ды наркаманіі, ну, як, скажам, зараз. Новай Вандэі, як пасьля развалу СССР ужо не будзе, а вось люстрацыі могуць быць і ўведзены...

С.Горкі.

ГУЛЬНЯ Ў СТАНДАРТЫ

Рэспубліка Беларусь—краіна ўнікальная. Кіруючаму колу дзяржавы ашалела хочацца быць наперадзе ўсёй планеты. Усё ўнармаваць і раскласьці па паліцах, навесьці парадак, ну скажам такі, як на могілках. Парадак аднак не вынікае з прымітыўнага прыбіраньня. Ён—праява ўнутранай арганізаванасьці і агульнай культуры, якія паказухай не выхаваць. Ды, відаць, гульня ў іх такая.

Ці адшукаеце вы яшчэ хоць адну такую краіну на постсавецкай прасторы, дзе б у кожным раёне ў гэтак званых кнігах " Памяці" былі зафіксаваны гістарычныя факты, у асноўным з савецкай рэчаіснасьці, пералічаны ўдзельнікі вайны, партызаны й падпольшчыкі, адзначаны гістарычныя, культурніцкія і іншыя значныя месцы. Здавалася б толькі радавацца можна, каб гэтыя працы ва ўсім насілі аб'ектыўны характар. Сучасным жа пастухам тутэйшага люду, як мага хутчэй, хочацца ў чарговы раз пісьмова зафіксаваць мыльныя ідэалагічныя і статыстычныя пухіры наконт мінулага і сучаснага. І пакуль яны гуляюць у свае цацкі ўжо вырастае чарговае пакаленьне манкуртаў, якія не ведаюць ані свае мовы, ані свае гісторыі.

Гульня, ў якую зараз гуляе кіраўніцтва Віцебскага раёну, як дарэчы і ўся краіна, называецца " Гульня ў нарматывы сацыяльных стандартаў". У прыватнасьці ідзе ўкараненьне ў адукацыйную сьферу раёна 8-мі нарматываў сацыяльных стандартаў.

Нарматыў № 14 " Забесьпячэньне дзяцей дашкольнага ўзросту месцамі ва ўстановах адукацыі" складае ажно102 адсоткі. На 1 студзеня 2005 году ў раёне пражывала 1760 дзяцей да 6-ці гадоў. 1047 з іх наведваюць дашкольныя ўстановы. Дзенідзе аднак у садках не хапае месцаў. Такое становішча ў Капцянскім, Тулаўскім, Альгоўскім, Запольскім садках-яслях.

Выконваецца і паказчык па стандарту № 15 " Падрыхтоўка пяцігадовых дзяцей да школы". У гэтым годзе іх—335. 279 наведваюць дзіцячыя ўстановы. 56 дзетак займаюцца з педагогамі ў канікулярны час.

У 2004 годзе на адно дзіцяці дашкольнага ўзросту з бюджэту выдзелялася ў год 1 млн. 918, 3 тыс. рублёў(1млн. 300 тыс. руб. па рэспубліцы). На аднаго школьніка выдзелялася 1 млн. 405, 5 тыс. руб. (па рэспубліцы 850 тыс.). У 2005 годзе гэтыя нарматывы павялічаны да 2 млн. 163 тыс. руб. у садках і да 1 млн. 682, 7 тыс. рублёў у школе. Гэтае павелічэньне можна ўспрымаць, і як узмацненьне клопату дзяржавы пра сваю будучыню, і як выключна механічны акт не зьвязаны з рэальнымі патрэбамі дзяцей.

Нарматыў № 20 " Бюджэтнае фінансаваньне на выхаваньне аднаго дзіця ва ўстановах пазашкольнага выхаваньня" склала ўсяго 70,2% ад рэспубліканскага і 102,3 адсоткі ад абласнога і раённага бюджэту.

Нарматывы № 21-22 выкананы за кошт скарачэньня колькасьці навучэнцаў на вёсцы. Вучням хапае плошчаў для навучаньня і заняткаў спортам.

Нарматыў № 23, які патрабуе адзін кампутар на 30 навучэнцаў ці не менш аднаго кампутарнага класу на школу, выконваецца таксама не ва ўсіх установах адукацыі раёну, хаця 16 зь іх забясьпечаны сучаснай тэхнікай. Тыя кампутары, што ёсьць у некаторых школах і лічацца сучаснымі ў многім ужо даўно састарэлі. Выхад у сусьветную павуціну даступны таксама нямногім. Да таго ж цяжка сабе ўявіць, каб вучань дзеля сваіх адукацыйных патрэбаў мог вольна выйсьці ў інтэрнэт. Ды і колькі сродкаў адводзіць дзяржава на гэтыя мэты нідзе адкрыта не паведамляецца. Кампутар даўно стаў ужо не сродкам раскошы ці забавы, а надзённай патрэбай маладзёнаў, якія хочаць крочыць у нагу з часам.

Вясковыя дзеці, і так абдзеленыя ў адукацыйных магчымасьцях, з такімі тэмпамі, якімі крочыць міністэрства адукацыі, і к канцу 12 клясы не здолеюць наблізіцца да стандартаў цывілізаванага сьвету, дзе кампутар ёсьць у кожнага навучэнца не толькі ў школе, але й дома. Нарматывы ж сацыяльных стандартаў патрэбныя ў першую чаргу дзеля стварэньня станоўчага іміджу дзяржавы на міжнароднай арэне. Часам яны бяруцца са столі і не маюць пад сабой папераканаўчай матывацыі. Іхняе ж укараненьне ў многім носіць фармальны характар. Так клас, укамплектаваны састарэлымі " Карвэтамі", пры неабходнасьці можна палічыць выкананьнем нарматыва № 23. Карацей кажучы, прыпіскі былі, прыпіскі й захаваліся.

КОЛАДЗЁН

Першы месяц лета прайшоў пад знакам працягу рэпрэсій уладаў супраць іншадумства на Беларусі.

Па-першае, улады працягвалі ціск на палітычныя партыі праз патрабаванне юрыдычных адрэсаў партыйных структур на офісах. Гэта квазі-прававы крок Мінюста да палітычных партый з'яўляецца доўгатэрмінова прапрацаванай аперацый па знішчэнню палітычных апанентаў. Якая прадпрымальніцкая структура прадаставіць памяшканне для апазіцыйнай структуры, калі адразу магчыма апынуцца пад шквалам разаральных праверак? Колькі будзе каштаваць арэнда для мясцовай суполкі невялічкага афісу? Не меней 25 000 рублёў у месяц. Гэта ціск вядзе да масавай ліквідацыі афіцыйнага статуса дэмакратычнай апазіцыі.

Па-другое, прайшоў чарговы судовы працэс супраць адзінай штодзеннай апазіцыйнай газеты Беларусі «Народнай волі». Псеўда-апазіцыянер Гайдукевіч выставіў зыск да газеты ў памеры 200 млн. рублёў. дзеля абароны гонару і атрымання маральнай кампенсацыі. Сума ў дзесяткі разоў вышэй кампенсацыі сем'ям дзяцей якія загінулі ў даўцы на станцыі «Няміга». І пры нашым справядлівым судзе атрымаў 100 млн. кампенсацыі. Для суцяшэння.

Па-трэццяе, улады пачалі жорсткі пераслед усіх іншадумцаў на Беларусі, якія маюць намер правесці сходы па абранню дэлегатаў на Кангрэс па абранню адзінага кандыдата ад апазіцыі на выбарах 2006 г.. Пры гэтым ахвярамі пераследу становяцца самыя актыўныя грамадзяне Беларусі: ў Гомелі – супрацоўнік музея, дэпутат гарсавету Юрась Глушакоў, ў Жлобіне – камуніст, намеснік начальніка цэху металургічнага заводу Валерый Рыбчанка, у Віцебску актывіст незарэгістраванага «Маладога Фронту» Яніс Чучман.

Асобнай падзеяй чэрвеня стаіць шматдзённая галадоўка Сяргея Скрабца, былога дэпутата Палаты, кіраўніка апазіцыйнай групы «Рэспубліка». Галадоўка распачата з 15 мая, з першага дня затрымання Скрабца ў Берасце. Такое адчуванне, што уладам мала аказалася матэрыялу пра 200 млн. даляраў, якія быццам везліся праз мяжу для Скрабца і вырашаны канчаткова засудіць апазіцыйнага палітыка. Але мужнасць дэпутата можа прывесці да першай смяротнай галадоўкі на Беларусі.

У чэрвені беларускія прадпрымальнікі атрымалі рашэнні уладаў па вырашэнню праблемы падатка на дабаўленую вартасць. Пры салодкіх каментарыях уладаў у выніку такой дапамогі правінцыйныя прадпрымальнікі павінны плаціць амаль у два разы больш падаткаў. Але пра гэта ужо асаблівая гаворка.

Л. Гаравы.

ДЗЕНЬ 41-Ы: СЯРГЕЙ СКРАБЕЦ НЕ СПЫНЯЕ ГАЛАДОЎКІ ЗА КРАТАМІ

24 чэрвеня інфармацыю пра стан здароўя Сяргея Скрабца нечaкана пераказаў вядомы адвакат і праваабаронца Гары Паганяйла. Ён спаслаўся на добра вядомыя яму крыніцы і распавёў пра тое, што робіць апошнім часам у сьледчым ізалятары былы дэпутат:

(Паганяйла:) "Канечне, ён працягвае галадаваць. Але ён не хацеў бы цяпер афішаваць гэтага, дзеля таго, каб не нанесьці траўмы бацькам. Аднак для таго, каб запрацавала перыстальтыка (а Скрабец вельмі дасьведчаны галадоўнік), ён зрабіў на некалькі дзён перапынак. Сапраўды, каб прымусіць запрацаваць перыстальтыку, ён пачаў ужываць сокі. І ўсё. А потым ён зноў вернецца да галадаваньня з ужываньнем выключна вады, для таго, каб працягнуць гэтую акцыю. Сама ідэя спыніць галадаваньне ім не ўспрымаецца".

Як сьведчаць лекары, падчас галадаваньня арганізм знаходзіцца ў стане фізіялягічнага адпачынку. Паколькі ежа ў арганізм не паступае, дык спыняецца перыстальтыка кішэчніка.

Фактычна тое ж самае мне распавёў сёньня і адвакат Скрабца Міхаіл Хоміч, які наведаў яго ў камэры сьледчага ізалятару ўвечары 24 чэрвеня:

(Хоміч:) "Чырвань нейкая. Схуднеў з твару. Вусны чырвоныя, пакусаныя... Зрэшты, я магу сказаць, што ён прытрымліваецца сваёй сыстэмы галадаваньня".

Сёньня стала вядомым імя новага сьледчага, які пачаў весьці справу Сяргея Скрабца. Ім стаў сьледчы ў асабліва важных справах рэспубліканскай пракуратуры Вячаслаў Цераховіч. Малодшы брат экс-парлямэнтара Аляксандар гаворыць, што ён ведае гэтага супрацоўніка праваахоўных органаў:

(Скрабец:) "Ён даўно ўжо займаецца гэтай справай, гады тры".

(Карэспандэнт:) "Маецца на ўвазе справа "БелБабаеўскага"?"

(Скрабец:) "Так, гэтая крымінальная справа застаецца".

Нагадаю, што ў красавіку 2003 году супраць Сяргея Скрабца завялі першую справу — тады яго абвінавацілі ў выманьваньні крэдытаў у дзяржавы ў той час, калі ён узначальваў Гандлёвы дом "БелБабаеўскі". Паводле намесьніка генэральнага пракурора Беларусі Мікалая Купрыянава, абедзьве крымінаnьныя справы цяпер аб'яднаныя ў адну. А берасьцейскі сьледчы Андрэй Ліванаў, паводле ягоных словаў, цяпер будзе займацца выключна той часткай, якая тычыцца другога абвінавачаньня — падрыхтоўка да злачынства і хабарніцтва.

Уладзімер Глод, Менск.

ЗВОЛЬНЕНЫ ЛІДЭР КАМУНІСТАЎ ЖЛОБІНУ

Дырэкцыя Беларускага мэталургічнага заводу звольніла з працы намесьніка начальніка цэха, старшыню Жлобінскай раённай арганізацыі Партыі камуністаў Беларускай Валера Рыбчанку. Пакуль актывіст у судзе аспрэчваў папярэднія вымовы адміністрацыі, выйшаў загад пра ягонае звальненьне.

У загадзе на звальненьне Валера Рыбчанкі, падпісаным выканаўцам абавязкаў генэральнага дырэктара Віктарам Матачкіным, сказана, што звальняецца ён за сыстэматычнае невыкананьне без паважных прычынаў абавязкаў, ускладзеных працоўнай дамовай.

(Рыбчанка:) "Дырэкцыя даўярцыла пачатае, каб пазбавіцца ад мяне як актывіста Партыі камуністаў Беларускай. І зрабіла гэта даволі хутка, усяго за паўдня. Дамагаецца паказаць астатнім: вось што мы робім зь любым актывістам, любым іншадумцам".

Сам Валер Рыбчанка зьбіраецца ў судах аспрэчваць свае пакараньні і звальненьне.

У оппозиции начались критические дни

Продлиться они могут до президентских выборов, а результат вполне прогнозируем — вместо противостоящих режиму партий и общественных объединений на политической сцене Беларуси должно остаться лишь воспоминание.

Сразу после прошлогоднего референдума Министерство юстиции разослало всем партиям и общественным объединениям письмо «О юридических адресах», в котором информировало получателей о необходимости изменить юридические адреса организационных структур, которые размещаются в квартирах. Срок на выполнение поручения был дан до 1 февраля.

Во-первых, снимать офис — дорогое удовольствие. Как высказался лидер Либерально-демократической партии **Сергей Гайдукевич**, *«нужно быть Рокфеллером, чтобы содержать все региональные объединения в офисах»*.

Во-вторых, изменение юридического адреса вынуждает региональные структуры вносить изменения в документы, поданные в местные учреждения юстиции. Практика показывает, что даже в мелочах низовые структуры партий и общественных объединений не всегда могут договориться с работниками исполкомов.

В общем, почти все оппозиционеры оттягивали решение «квартирного вопроса», как могли. Однако 1 февраля наступило неизбежно, и все разговоры о правовых и практических аспектах смены адреса разбились о вполне понятные устремления властей. Тем не менее в феврале Минюст продлил срок выполнения политическими партиями и общественными объединениями требования касательно юридических адресов. Очередной «день икс» наступил в минувшую среду, 1 июня. Отсрочка, вероятно, была обусловлена желанием Минюста соблюсти приличия в отношениях с партиями и НГО. Теперь срок истек, и милостей от Минюста больше ждать не стоит. *«Времени было достаточно. Теперь необходимо поставить точку в этом вопросе. Структуры, не выполнившие необходимую процедуру перерегистрации, будут сниматься с учета»*, — заявил на пресс-конференции 1 июня министр юстиции **Виктор Голованов**.

Сами партии к этому дню подошли по-разному. Те из них, которые не нашли возможности получить офисное помещение, начали разрушаться в судебном порядке. Например, в последние дни мая Верховный суд принял решение об упразднении двух районных структур Партии БНФ в Гродно. Основанием для ликвидации стало нахождение юридических адресов ячеек в жилом фонде.

Объединенная гражданская партия сама пошла на частичную ликвидацию своих низовых структур и сняла с учета порядка 15 своих региональных организаций. *«Если даже мы ликвидируем свои структуры в регионах, наши активисты, которые проживают на данных территориях, вне партии не остаются. В соответствии с уставом партии мы прикрепляем этих людей к ближайшим региональным структурам»*, — сообщил зампредседателя ОГП **Сергей Альфер**.

Лидер партии **Анатолий Лебедько** необходимость ликвидации своих структур в регионах расценивает как кампанию репрессий накануне президентских выборов, которую начинает власть в отношении оппозиции: *«Безусловно, фактическая ликвидация оргструктур снижает наши возможности как политической структуры в контексте избирательных кампаний* ***(партии, у которых нет зарегистрированной структуры на местах, не смогут выдвигать на данной территории своих кандидатов в депутаты в ходе парламентских и местных выборов. — Д.В.).*** *Но мы реалисты и понимаем, в какой живем стране. Власть желает любыми способами свести влияние партий внутри страны к нулю»*.

В целом большинство белорусских партий в отведенный им период, как и ОГП, частично ликвидировало низовые структуры, а затем пыталось присоединять людские ресурсы исчезнувших организаций к тем, которые имеют офисные помещения.

Ситуация с неправительственными организациями отличается ненамного.

— *Сегодня спокойно себя в Беларуси могут чувствовать те общественные объединения, которые практически не касаются политических вопросов, заявляют о своей прогосударственной позиции*, — говорит **Елена Тонкачева**, возглавлявшая ликвидированное ОО «Независимое общество правовых исследований». — *Оказывать давление на общественные объединения системно начали в 1999 году. Тогда Минюстом специально была проведена перерегистрация общественных объединений с целью «навести порядок» в третьем секторе. Это произошло за полтора года до парламентских выборов. В 2003 году, опять-таки за год до начала электорального процесса, было ликвидировано порядка 50 общественных организаций. Сегодня, за год до президентских выборов, мы видим вмешательство в процесс деятельности общественных объединений. Третий сектор стараются отвлечь от профессиональной деятельности и заставить решать «квартирный вопрос»*.

По словам Е.Тонкачевой, *«в последние полгода ряд видных общественных объединений, таких как Белорусский Хельсинкский комитет, Белорусская организация трудящихся женщин, был вынужден пойти на ликвидацию своих низовых структур. А что делать? Не снимешь свою региональную структуру с учета в управлении юстиции самостоятельно — это сделают за тебя, а общественной организации за неповоротливость выпишут еще и предупреждение»*.

Отвечая 1 июня в ходе пресс-конференции на вопрос корреспондента *«БДГ»*, Виктор Голованов сообщил, что до 6 июня управления юстиции на местах должны снять с учета региональные структуры общественных объединений и политических партий, которые все еще располагаются в квартирах. Кто не разбежался, Минюст не виноват.

Дмитрий ВОЛКОВ, *«Белорусская деловая газета».*

«Калі іх выклікалі да дырэктара трэці раз, дзеці пачалі адмаўляцца ад сваіх подпісаў»

Ганна Соусь, Менск. *У Менскім гаспадарчым судзе адбыліся перадсудовыя гутаркі рэдактара "Народнай Волі" з прадстаўнікамі салігорскага прадпрыемства "Беларуськалій" і горна-хімічнага тэхнікуму Салігорску. Гэтыя ўстановы праз суд абараняюць сваю дзелавую рэпутацыю ў сувязі з тым, што ў "Народнай Волі" пад зваротам руху "Воля народу" былі надрукаваныя подпісы іх работнікаў і навучэнцаў.*

З Салігорску ў Менскі гаспадарчы суд прыбылі прадстаўніца "Беларуськалію" і дырэктар горнахімічнага тэхнікуму Салігорску разам з адвакатам. Усе яны адмовіліся патлумачыць для Радыё Свабода сутнасьць сваіх прэтэнзіяў да "Народнай Волі". У салігорскім тэхнікуме пад зваротам руху "Воля народу" падпісаліся 37 студэнтаў, і большасьць зь іх потым адмовіліся ад сваіх подпісаў альбо сказалі, што ня ставілі іх. Вось што распавёў Радыё Свабода студэнт тэхнікуму Уладзімер Лемяш, які зьбіраў подпісы:

(Лемеш:) "Калі я зьбіраў подпісы, мне гаварылі, што яны нідзе друкавацца ня будуць, што гэта будзе піяр-акцыя. Пры мне падпісаліся чалавек дзевятнаццаць. Ліст з подпісамі быў у іншых групах. Калі пачалося разьбіральніцтва, дзеці спачатку трымаліся. Пасьля трэцяга разу, калі іх выклікалі да дырэктара, яны пачалі адмаўляцца. Іх сабралі ў адну групу, далі лісты, дзе ўсё загадзя было напісана, і яны пад гэтым падпісаліся".

Як паведаміў Радыё Свабода галоўны рэдактар "Народнай Волі" Іосіф Сярэдзіч, у часе перадсудовай гутаркі бакі імкнуліся знайсьці кампраміс. Днямі ў "Народнай Волі" будзе надрукаваны артыкул, у якім будуць выкладзеныя пазыцыі кіраўніцтва тэхнікуму і самой рэдакцыі, і на гэтым канфлікт можа быць вычарпаны. Што да судовых прэтэнзіяў прадпрыемства "Беларуськалій", то, паводе Сярэдзіча, канфлікт, верагодна, можа быць вырашаны аналягічным чынам, і справа ня дойдзе да суду.

Калі пазовы "Беларуськалію" і салігорскага тэхнікуму былі без матэрыяльных патрабаваньняў, то чацьвёра супрацоўнікаў "Беларуськалію" патрабуюць ад "Народнай Волі" кожны 50 мільёнаў рублёў. І заўтра ў Ленінскім судзе пачнецца судовае разьбіральніцтва гэтых пазоваў. А 9 чэрвеня суд пачне разглядаць аналягічныя пазовы чатырох жыхароў Клецку, кожны зь якіх хоча атрымаць ад "Народнай Волі" 5 мільёнаў рублёў.

Аляксандар Казулін папрасіў прабачэньня ў сяброў створанага ім руху "Воля народу"

Уладзімер Глод, Менск. *Патэнцыйны кандыдат у прэзыдэнты Беларусі перапрасіў прабачэньня ў сваім артыкуле, які надрукаваны ў сёньняшнім нумары газэты "Народная Воля".*

Аляксандар Казулін называе асноўныя прычыны, якія прывялі да памылак і, паводле ягоных словаў, падштурхнулі яго ў хітра расстаўленую пастку. Па-першае, вялікі страх жыхароў Беларусі, з-за якога некаторыя падпісанты звароту ў падтрымку руху "Воля народу" наўмысна скажалі свае прозьвішчы, ставілі несапраўдныя ініцыялы. Да гэтага дадаецца і моцны ціск на тых, чые прозьвішчы былі надрукаваныя. Некаторыя асобы ня вытрымалі і заявілі, што яны сваіх подпісаў пад зваротам ня ставілі. Яшчэ адна прычына, якую называе спадар Казулін, нядобрасумленнасьць некаторых зборшчыкаў подпісаў, якія падкінулі ў сьпіс долю "мёртвых душаў". І, нарэшце, як сьцьвярджае спадар Казулін, высьветлілася, што сярод зборшчыкаў подпісаў створанага руху апынуліся і прафэсійныя правакатары.

Палітолягі падкрэсьліваюць: прызнаньне ўласных памылак ня ёсьць характэрнай рысай беларускіх палітыкаў — як афіцыйных, так і апазыцыйных. І таму ўчынак Аляксандра Казуліна выразна адрозьніваецца ад іншых. Як ягоныя прабачэньні могуць паўплываць на імідж спадара Казуліна? Журналіст і палітоляг Аляксандар Класкоўскі лічыць, што гэтае пытаньне ня простае:

(Класкоўскі:) "З аднаго боку, гэты жэст сапраўды выглядае высакародным. Аднак, насамрэч, я думаю, гэта, хутчэй, перадусім тактычная дапамога рэдакцыі "Народнай Волі", якая цяпер атачаная судовымі пазовамі, і наагул пад пагрозай закрыцьця. Што ж тычыцца грамадзкага рэзанансу, дык выпраўленьню іміджу створанага руху, іміджу навасьпечанага палітыка Казуліна, то тут ёсьць вялікае пытаньне.

Дэпутата Рамуальда Улана пазбавілі паўнамоцтваў

Сяргей Астраўцоў, Горадня. **Дэпутаты Смаргонскага раённага Савету аднагалосна пазбавілі дэпутацкіх паўнамоцтваў прадстаўніка мясцовых дэмакратычных колаў Рамуальда Улана. Ён — прадпрымальнік, у нядалёкім мінулым — заснавальнік і рэдактар "Новой газеты Сморгони", для закрыцьця якой улады зрабілі шмат намаганьняў.**

Летась спадара Улана засудзілі да двух гадоў калёніі — пасьля таго, як ён, едучы на машыне, па неасьцярожнасьці зьбіў жанчыну на ровары. якая засталася жывой. Паводле смаргонскага праваабаронцы Алеся Дзергачова, экспэрты прызналі Улана невінаватым у здарэньні, і прысуд быў неапраўдана жорсткім. У жанчыны была зламана ключыца і пашкоджаны пазваночнік, у рашэньні суду гаварылася, што яна атрымала інваліднасьць. Для параўнаньня: летась міліцыянт у Слоніме зьбіў насьмерць дзяўчыну і ўцёк зь месца здарэньня, суд пакараў яго абмежаваньнем волі —гэтак званай "хіміяй".

Летась Улану паводле амністыі скасавалі адзін год пакараньня. У калёнію ён ня трапіў, а сёлета ўвогуле падпадаў пад амністыю, абвешчаную да Дня перамогі. Паводле Дзергачова, дакумэнты аб амністыі Улана і — адпаведна поўным скасаваньні тэрміна пакараньня суд павінен быў разгледзець напярэдадні сэсіі райсавету, але судовае паседжаньне не адбылося. А 22 чэрвеня спадара Улана пазбавілі дэпутацкіх паўнамоцтваў.

ЦІ БУДЗЕ ПРЫВАТНЫМ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ ЛЯГЧЭЙ ПРАЦАВАЦЬ ПА НОВЫМ ПРЭЗЫДЭНЦКІМ УКАЗЕ?

Валер Карбалевіч, Менск. *Новая перадача сэрыі "Экспэрты за Свабоды". Удзельнікі: намесьнік кіраўніка Віцебскай абласной філіі аб'яднаньня "Пэрспэктыва" Барыс Элькін зь Віцебску і юрыст Сяргей Балыкін зь Менску.*

(Валер Карбалевіч:) "Ужо колькі дзён Беларускае тэлебачаньне распавядае пра тое, які важны ўказ выдаў Лукашэнка і як задаволеныя ім прадпрымальнікі. У пэўным сэнсе ў гэтым дакумэнце сапраўды зроблены крок насустрач прыватным прадпрымальнікам. Адным з галоўных іхных патрабаваньняў падчас страйку ў лютым-сакавіку гэтага году была адмена падатку на даданую вартасьць. Але Лукашэнка падчас сустрэчы з прадпрымальнікамі 10 сакавіка цьвёрда заявіў, што гэты падатак плаціць давядзецца. І ягоны ўказ ад 24 сакавіка 2005 году таксама прадугледжваў уплату падатку на даданую вартасьць.

Але ў новым указе №285 "Аб некаторых мерах дзеля рэгуляваньня прадпрымальніцкай дзейнасьці" ад 18 чэрвеня фактычна даецца магчымасьць замест гэтага падатку плаціць павышаную стаўку адзінага падатку. Ці можна гэта разглядаць як крок улады насустрач прадпрымальнікам?"

(Барыс Элькін:) "Ва ўладаў адна мэта. Ёй страшна патрабуюцца грошы і хуткія грошы, якія трэба недзе ўзяць. Я б ня стаў казаць, што гэта ёсьць крокам насустрач прадпрымальнікам. У гэтым указе няма захадаў дзеля паляпшэньня становішча прадпрымальнікаў".

(Карбалевіч:) "Хачу ўдакладніць, што для прадпрымальніка лепш: плаціць павышаны адзіны падатак альбо падатак на даданую вартасьць?"

(Элькін:) "Па вялікім рахунку, розьніцы няма. Альбо заплаціць падатак на даданую вартасьць зь вялікаю колькасьцю папераў і разарыцца, альбо заплаціць вялікі адзіны падатак і разарыцца. Фінал у п'есы адзін".

(Сяргей Балыкін:) "Паводле новага ўказу плаціць давядзецца больш прыкладна ў тры разы. Падатак на даданую вартасьць можна замяніць адным падаткам у цьвёрдых сумах, які вызначаецца па формуле: адзіная стаўка падатку памножаная на тры. Прадпрымальнікам давядзецца паднясьць цэны на свае тавары. Шмат хто зь іх пакіне бізнэс. Але ўсё ж плаціць адзіны падатак у цьвёрдай суме лепш, чым вылічваць самому падатак на даданую вартасьць, альбо, што яшчэ горш, калі яго вызначаць нейкія кантрольныя органы".

(Карбалевіч:) "Указ прадугледжвае новыя абмежаваньні ў дзейнасьці прыватных прадпрымальнікаў. Так ім забараняецца мець больш за чатыры гандлёвыя і іншыя аб'екты, уключна з транспартнымі сродкамі. Як гэта можна пракамэнтаваць?"

(Элькін:) "У выніку ўказу прадпрымальнікам стала горш. Дзяржава ўсімі сродкамі абмяжоўвае прыватную ініцыятыву, умешваецца ў эканамічныя працэсы, якія самарэгулявальныя. **Як я разумею, пастаўленая мэта зьнішчыць прыватную ініцыятыву. І пад гэты плян зьявіўся такі ўказ.** Адзін прыклад з прыватнымі крамамі. Яны плацяць 78% падаткаў, а дазволеная нацэнка — 30%. І аддзел цэнаў аблвыканкаму можа зачыніць усе прыватныя крамы, пазбавіць ліцэнзіі за два тыдні, таму што яны ўсе вымушаныя парушаць правілы цэнаўтварэньня.

Што тычыцца абмежаваньня ў валоданьні чатырма аб'ектамі. Дасюль моцнага кантролю ў абмежаваньні мець ня больш за трох наёмных супрацоўнікаў не было, то цяпер ён зьявіцца. І калі ўбачаць парушэньні ў колькасьці супрацоўнікаў ці аб'ектаў, то прадпрымальніка пазбавяць ліцэнзіі".

(Балыкін:) "Гэтыя абмежаваньні ў чатыры аб'екты я лічу самым небясьпечным у гэтым указе. Дадзены ўказ замяніў дэкрэт №4, які страціў сваю сілу. Новыя абмежаваньні пашырыліся і сталі больш жорсткімі. Невядома, як будзе рэалізавана гэтае абмежаваньне на чатыры аб'екты на практыцы. Не выключаю такой трактоўкі гэтага палажэньня, што прадпрымальнік можа мець альбо чатыры шапікі, альбо тры шапікі і склад, альбо адзін шапік, два аўтамабілі і адзін склад.

Таксама небясьпечным зьяўляецца тое, што ўказ уводзіць новыя жорсткія штрафы. Уводзіцца абавязковае запаўненьне кнігі ўліку тавараў. **І любыя недакладнасьці ва ўліку караюцца штрафам да 50 базавых адзінак.** Калі прадпрымальнік ня мае на працоўным месцы копіі дакумэнту аб уплаце адзінага падатку, то можа быць аштрафаваны на пяць базавых адзінак. І такіх прыкладаў шмат. Усё гэта сьведчыць пра тое, што ўлада імкнецца закруціць гайкі, паставіць прадпрымальнікаў у больш жорсткія ўмовы. Разуменьне эканамічных праблемаў кіраўніцтвам дзяржавы, Лукашэнкам такое, што прадпрымальнікі павінны быць уключаныя ў нейкі дзяржаўны мэханізм, зьяўляцца "шрубам". І, паводле такіх уяўленьняў, дзяржава павінна кіраваць прадпрымальнікамі адміністрацыйнымі мэтадамі. І гэты ўказ цалкам адпавядае такой дзяржаўнай палітыцы".

(Карбалевіч:) "Якая рэакцыя прадпрымальнікаў на гэты дакумэнт? Якія асноўныя прэтэнзіі да яго, прапановы?"

(Элькін:) "Мы прапануем альтэрнатыву яшчэ з сакавіка. Яе сутнасьць палягае ў арганізацыі па расейскім варыянце — спрошчаная сыстэма мытнага афармленьня і транспартыроўкі грузаў з краінаў (Турэччына, Кітай), дзе тавар купляецца. Але ўлады нашых прапановаў не падтрымалі. Гэты ўказ выклікаў моцную нэгатыўную рэакцыі прадпрымальнікаў. Таму што галоўны яго сэнс — штрафы і забароны. Учора ў Менску пачала працу нарада старшыняў саветаў рынкаў (гэта новыя органы, створаныя паводле папярэдняга ўказу Лукашэнкі), прадстаўнікоў грамадзкіх аб'яднаньняў, прафсаюзаў прадпрымальнікаў. Абмяркоўваецца гэты ўказ. І стаўленьне да ўказу адмоўнае. Таму што немагчыма будзе працаваць, прадпрымальнікі страцяць усё. Распрацоўваецца дакумэнт, які будзе надрукаваны, дасланы ў органы ўлады. Ёсьць надзея, што яшчэ нешта можна зьмяніць да 1 жніўня, зь якога ўказ уступае ў сілу.

Трэба мець на ўвазе такую акалічнасьць. Калі ў Менску прадпрымальнікі яшчэ змогуць выжыць, то, напрыклад, у Віцебску альбо ў малых гарадах (Лёзна, Гарадок і іншых) сытуацыя горшая. Там у насельніцтва мала грошай, а значыць, ня могуць зарабляць і прадпрымальнікі".

(Элькін:) "Дарэчы, учора група тэлежурналістаў з тэлеканалу ОНТ прыехала на нашую прадпрымальніцкую нараду. Яны, нібыта, бралі інтэрвію ў трох прадпрымальнікаў зь невялікіх гарадоў. Я стаяў побач і бачыў, што падчас гэтага інтэрвію быў адключаны мікрафон. Я разумею, здымалі малюнак, каб потым уставіць свае камэнтары".

АДЗНАЧЫЛІ 81-Ы ДЗЕНЬ НАРАДЖЭНЬНЯ ВАСІЛЯ БЫКАВА

У вёсцы Бычкі, дакладней, у мэмарыяльным музэі Васіля Быкава я не была каля году. І, як на мой погляд, зь леташняга адкрыцьця там нічога не зьмянілася: нават драўляная новая хатка, адбудаваная паводле аўтэнтычнага праекту на месцы зьнесенай хаты сям"і Быкавых, зусім не пацямнела за зіму. Але за гэты час, кажа ўдава малодшага брата пісьменьніка і цяперашняя наглядчыца музэю Антаніна Быкава, тут пабывала вельмі шмат людзей – столькі, колькі ў Бычках, дзе сёньня жывуць усяго 23 чалавекі, ня бачылі ўжо даўно.

(Антаніна Быкава:) «Прыяжджаюць! І школьнікі, што ў вандроўкі ходзяць, і з санаторыі "Лясныя азёры" аўтобуса тры, мусіць, былі. Зімой дык дарогу да нас занесла, нейк дабірацца было, а цяпер дык лета. Сястра Васіля стрыечная во прыехала, і пляменьніцы з мужамі. Сястра дык была тут і летась, а гэтыя маладзейшыя – упершыню. Многа, многа сюды хто езьдзіць!»

Акрамя сваякоў, у быкаўскім музэі сустрэліся ўчора прадстаўнікі віцебскага абласнога Таварыства беларускай мовы і культурна-асьветнага цэнтру імя Язэпа Драздовіча, якім кіруе Ада Райчонак з Шаркоўшчыны. Проста ў музэі яны правялі імпрэзу, прысьвечаную Васілю Быкаву – віцебскі паэт Давід Сімановіч пачытаў вершы, бард Георгі Станкевіч зь Бешанковічаў прасьпяваў некалькі ўласных песень, старшыня абласной Рады ТБМ Іосіф Навумчык падараваў музэю ксэракопіі малюнкаў Васіля Быкава, якія, дарэчы, будуць уключаныя ў другое выданьне кнігі "Быкаў на "Свабодзе", і некалькі фотаздымкаў з мінулагодняга адкрыцьця і сьвяткаваньняў 80-х угодкаў Васіля Быкава. Як і ў мінулым годзе, невялічкую экскурсію па мэмарыяльным музэі папрасілі правесьці сястру пісьменьніка, Валянціну Быкаву.

(Валяніна Быкава:) «Так, мой брат. Гэта яшчэ пашукаць трэба такога брата! Такі ён быў добры, чулы, такі сумленны быў, што нават бяз сьлёз і гаварыць не магу пра яго.

Спадарыня Валянціна вельмі прачула распавядала пра свайго брата, згадвалі свайго земляка аднавяскоўцы, і музэйная "Кніга водгукаў" папоўнілася за ўчорашні дзень яшчэ дзесяткам надпісаў удзячных наведнікаў.

Летась у Бычкі прыяжджалі шматлікія прадстаўнікі дзяржаўных уладаў: і раённых, і абласных. Учора прадстаўнікоў улады не было. Вяскоўцы кажуць, што ня бачылі іх тут і цягам году. Зрэшты, як кажа дырэктар Вушацкага музэю, філіяй якога ёсьць музэй у Бычках, Мікалай Кірпіч, раённае начальства амаль перастала цікавіцца быкаўскім музэем ці не адразу пасьля адкрыцьця. Спачатку будаўніцтва прысьпешвалі, а цяпер нікога не хвалюе, што нефарбаваныя сьцены так і не апрацаваныя сродкам ад шашалю ды іншых шкоднікаў, і што другія рамы для вокнаў дагэтуль ня зробленыя. Цяпер раённае кіраўніцтва рыхтуецца да сьвяткаваньня 100-гадовага юбілею Петруся Броўкі, мэмарыяльны музэй якога таксама месьціцца ў Вушацкім раёне. Гэта філія менскага літаратурнага музэю. А што да пэрспэктываў музэю Васіля Быкава, то клопат пра гэта цалкам лёг на плечы вушацкіх "музэйшчыкаў" і перадусім дырэктара Мікалая Кірпіча.

(Кірпіч:) «Як мы тут выкруцімся, я ня ведаю, але мы распрацавалі навуковую канцэпцыю і зробім экспазыцыю па Вушацкім пэрыядзе жыцьця Быкава – ад нараджэньня да таго часу, як ён паехаў адсюль вучыцца. Ёсьць добрыя матэрыялы, малюнкі Васіля Быкава, так што зробім!»

Нагадаю слухачам, што гэты месяц у нашым эфіры прысьвечаны Васілю Быкаву. Цяпер некалькі разоў на тыдзень гучыць перадача Аляксандра Лукашука «Лісты на Свабоду» пра яго перапіску з Васілём Быкавым. Сёньня ў вечаровым эфіры – чарговая перадача цыклю. А на гэтым тыдні прагучаць і некалькі перадачаў Сяргея Навумчыка, прысьвечаных апошнім тыдням Васіля Быкава.

Браніслава Станкевіч.



АЛЕКСАНДР ЛУКАШЕНКО ПОМИЛОВАЛ ЭКС-УПРАВЛЯЮЩУЮ ДЕЛАМИ ПРЕЗИДЕНТА ГАЛИНУ ЖУРАВКОВУ?

В феврале этого года суд признал ее виновной по ч.4 ст.210 Уголовного кодекса (хищение путем злоупотребления служебными полномочиями, совершенное организованной группой либо в особо крупном размере). В результате ее деятельности государству, по мнению правосудия, был нанесен ущерб в размере более 3 млн долларов. В ходе разбирательства Галина Журавкова виноватой считает себя только перед президентом.

Тем не менее суд, согласившись с прокурором, приговорил ее к 4 годам лишения свободы. Учитывая тяжесть обвинения, вердикт можно назвать относительно мягким. Однако на этом странное благоволение к Журавковой не закончилось. Даже спустя несколько месяцев после суда ее не спешили этапировать в колонию.

По информации «БДГ», неофициально полученной из правоохранительных органов, Александр Лукашенко подписал указ о помиловании своей бывшей соратницы.

Когда же корреспонденты «БДГ» попытались официально подтвердить данные сведения, собеседники в официальных структурах не могли ни подтвердить, ни опровергнуть нашу информацию, хотя, казалось бы, чего уж легче. Единственный внятный ответ был получен от Департамента по исполнению наказаний МВД. Там заявили, что осужденная Журавкова не прибыла в места лишения свободы.

ІНТЭРНЭТ-НАВІНЫ

Працягвае удаскананьвацца сайт http://www.hasciniec.org актывістаў НДА паўночна-усходняй часткі Віцебшчыны. За апошні месяц зроблены удасканаленні дызайна сайту, а таксама значна лягчэй стала трапляць на навіны з нашых раёнаў — Віцебскага, Гарадоцкага, Бешанковіцкага, Шумілінскага. Адначасова з гэтым з'явіўся інформер аб прагнозе надвор'я на усходні рэгіён Віцебшчыны. Таксама павялічылася колькасць іконак партнэрскіх сайтаў з якіх магчыма атрымаць праўдзівую інфармацыю.

Важнай часткай працы над сайтам стала павелічэнне частаты апытання наведвальнікаў сайта. За чэрвень такіх апытанняў зроблена два і вынікі іх прадстаўлены вашай увазе.

Як Вы ставіцеся да галадоўкі адлічаных па палітычных матывах з навучальных устаноў у г. Жодзіна?

Падтрымліваю і ўхваляю	81,48%
Мяне гэта не хвалюе	0%
Упершыню чую	0%
Гэта нічога не дасць	18,52%

Як Вы ставіцеся да прысудаў А. Клімаву, П. Севярынцу і М. Статкевічу - па 1,5-2 гады хіміі?

Гэта палітычны заказ улады	100%
Не трэба парушаць існуючае заканадаўства	0%
Суд праявіў гуманізм	0%
Нічога пра гэта не ведаю	0%

КАЛІ ПЕРАСТАНЕМ РАЗМАЎЛЯЦЬ НА МОВЕ АКУПАНТАЎ?

Не хачу быць ўдома эмігрантам,
гаспадар я ўсё-ткі, а не госьць.
Гаварыць на мове акупантаў,
калі мова матчыная ёсьць?!
Ларыса Геніюш.

Абразьлівае стаўленьне з боку сваіх жа суграмадзянаў да беларускае мовы можна пачуць у Беларусі нярэдка. Неяк надоечы, прапанаваўшы маладзёнам улётку, ў адказ на маё "бярыце" пачуў зьдзеклівы паўтор з узмоцненым націскам на "ры". Можна было б пакінуць паза ўвагай непрыхаваную абразу і ніяк не рэагаваць на гэта, але не стрываўся, нешта сказаў у адказ. Зараз думаю: дарэмна. "Не сыпце пэрліны перад сьвіньнямі". Або, як той казаў: "Гарбатага магіла выправіць".

Ёсьць і іншая рэакцыя на беларускае слова: вусьціш, здранцьвеньне. Ствараецца ўражаньне, быццам чалавек адгарадзіўся ад цябе нейкай непранікальнай заслонай. Беларуская ж фраза, сказаная агрэсіўна, ледзьве не паралізуе слухачоў. Неяк на добрым падпітку ў вагоне дызеля выказаў па-беларуску абурэньне з нагоды таго, што беларусу ў ягонай краіне ўжо і сесьці некуды (мая жонка села на ўжо занятае кімсьці месца). Увесь вагон на хвіліну суцішыўся і пытаньняў больш не ўзьнікала.

Ёсьць, безумоўна, і натуральнае ўспрыманьне— гэта, калі чалавек ніяк не рэагуе, як скажам, на паветра ці на тое ж рускае слова. Менавіта так рэагуюць вяскоўцы, асабліва старыя. З гэтае кропкі і паспрабуем прасачыць шлях ад натуральнасьці да закамплексаванасьці, паспрабуем зразумець прычыны моўнай агрэсіі.

Ужо маё пакаленьне, яшчэ напаўбеларускамоўнае ў дзяцінстве, апрацаванае настаўнікамі- янычарамі і сродкамі масавай інфармацыі, разьвіталася з радавымі плямамі беларускасьці ў дарослым жыцьці, калі асабістая дзейнасьць не была непасрэдна зьвязаная з моваю, альбо пад уплывам сацыяльна-палітычных працэсаў не прыйшло натуральнае ўсьведамленьне важнасьці нацыянальнага самавызначэньня. Ды нават прафесійная беларускамоўнасьць не ратавала ад моўнай дэградацыі і моўнага рэтраградства. Да сёньня моўныя пурысты непрымальна ставяцца да тарашкевіцы. Таксама, як беларусафобы да наркамаўскай беларускае мовы.

Сёньняшнія пакаленьні моладзі ставяцца да беларускамоўнасьці, як да абавязку з якім у межах школы прыходзіцца мірыцца, але пра які ніхто не ўзгадвае ў дарослым жыцьці. Гэткая дзіцячая гульня, у якую нейкія дзівакі чамусьці гуляюць і ў дарослым узросьце. Вось гэтая гульня і раздражняе агрэсіўных носьбітаў рускамоўнасьці, як непітушчую жонку муж-алькаголік. Чаму раздражняе. Таму, што недзе там глыбока ў падсьвядомасьці ўсё-ткі жыве незьнікальнае пачуцьцё віны за сваё сьвядомае ці несьвядомае аняменьне. Жывеш сабе спакойна, і раптам зьяўляецца той, хто нагадае пра здраду і хаця б умоўна запатрабоўвае ад цябе зьмяніцца. Каму прыемна? А галава забіта мітамі пра недасканаласьць, пра вясковасьць, пра другараднасьць, пра абмежаванасьць, пра беднасьць і неарыстакратычнасьць мовы. Значыць і ты павінен стаць недасканалым, "дзярэўняй", бедным, другарадным, абмежаваным. Каму захочацца?

Як ведаем, супраціў беларусізацыі ў 20-30-я гады быў немалы, ды і ў 90-я людцы абурыліся і паўсталі супраць. Супрацівы самі па сабе ўзьнікаюць рэдка— значыць, знайшліся гульцы, што сыгралі на чалавечых інстынктах супроць духовага, прававога і эканамічнага разьвіцьця беларускай нацыі. Знайшліся тады і знайшліся зараз.

А ў прынцыпе моўны нігілізм—ёсьць вынікам унутранай і прававой несвабоды. Мова акупантаў-імперыялістаў для паняволеных абарыгенаў найчасьцей як пропуск у іншы сьвет, як уяўная далучанасьць да "супернацыі", асабліва, калі колер скуры пры тым аднолькавы. А раб за свабоду змагацца не будзе, абы кішкі далі набіць, і на тым дзякуй. Зноў замкнёнае кола, якое раней ці пазьней усё адно некаму прыдзецца разрываць.

Рэдактар.

Заснавальнік і рэдактар: Сяржук Салодкі.
Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, 3-я Мопраўская, д. 14, тэл. 26-42-02

Выдадзена пры падтрымцы Віцебскага аддзялення ГА "Фонд імя Льва Сапегі".
Распаўсюджваецца бясплатна. Наклад 290 асобнікаў.